**« »**

У пачатку сакавіка ў Мінску, у кінатэатры “Цэнтральны”, адкрылася выстаўка “Суквецце”, на якой экспануюцца работы 15 мастакоў, сярод якіх творы выкладчыка кафедры выяўленчага мастацтва ВДУ імя П.М. Машэрава Дз.М. Кузьміча, а таксама работы выпускнікоў мастацка-графічнага факультэта В. Данілава і Ю. Нявейкі. Рэалістычныя і абстрактныя карціны мастакоў, што прадстаўлены на выставе, аб’яднаны тэмай любові да жыцця, прыгожага, абуджэння прыроды і цвіцення.

**« »**

5-га сакавіка ў рамках правядзення Тыдня мастацка-графічнага факультэта ў выставачнай зале ДУА “Дзіцячая мастацкая школа імя І.Ф. Хруцкага г. Наваполацка” была адкрыта выстаўка творчых работ выкладчыкаў кафедры выяўленчага мастацтва ВДУ імя П.М. Машэрава “Мы з мастацка-графічнага”.

Экспазіцыю выстаўкі склалі чатыры дзясяткі жывапісных і графічных работ, якія выкананы ў розных матэрыялах і тэхніках.

**« »**

6 сакавіка ў межах развіцця супрацоўніцтва ў Віцебскім дзяржаўным ордэна Дружбы народаў медыцынскім універсітэце была прадстаўлена выстаўка работ прафесара кафедры выяўленчага мастацтва мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава Рыгора Фядзькова. Экспазіцыю выстаўкі склалі жывапісныя эцюды Віцебшчыны, якія аўтар выканаў на пленэры вясной, летам і восенню 2022 года.

**« »**

17 сакавіка ў Арт-цэнтры Марка Шагала адкрылася выстава выпускніка мастацка-графічнага факультэта 1976 года, члена Беларускага саюза мастакоў Міхаіла Ляўковіча. Мастак і педагог чатыры дзесяцігоддзі (да 2015 г.) выкладаў на кафедры выяўленчага мастацтва ВДУ імя П.М. Машэрава жывапіс, малюнак і кампазіцыю.

У экспазіцыі выстаўкі пад назвай “Тры партрэты +” разам з фігуратыўнымі работамі (партрэтамі, нацюрмортамі) аўтар прадставіў і фармальныя жывапісныя кампазіцыі ў тэхніцы алейнага жывапісу, якой аддае перавагу ў апошнія гады.

**« »**

28 сакавіка ў выставачнай зале мастацка-графічнага факультэта пачала сваю працу мастацкая выстава пад назвай “Шляхі творчасці”. Своеасаблівасць выстаўкі ў тым, што ў рамках праекта “Настаўнік і вучні” ў экспазіцыі прадстаўлены работы педагога-мастака, выпускніцы мастацка-графічнага факультэта Ірыны Башун і яе вучняў – навучэнцаў ДУА “Дзіцячая мастацкая школа імя І.Ф. Хруцкага г. Наваполацка”.

**« »**

З 7 красавіка па 24 мая ў выставачнай зале гісторыка-краязнаўчага музея горада Дуброўна была разгорнута выстава дыпломных работ кафедры выяўленчага мастацтва і кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ВДУ імя П.М. Машэрава.

« »

У пачатку мая ў выставачнай зале мастацка-графічнага факультэта адкрылася выстава творчых работ навучэнцаў мастацкага аддзялення ДУА "Дзіцячая школа мастацтваў № 1 г. Віцебска". Выстаўка арганізавана ў рамках дзейнасці філіяла кафедры выяўленчага мастацтва, які ўжо некалькі гадоў працуе на базе школы мастацтваў.

« »

5-га мая ў выставачнай зале Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва адбылося адкрыццё мастацкага праекта "Графіка", які аб'ядноўвае дзве вельмі прадстаўнічыя выставы твораў выпускнікоў і студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў (куратар А. Зайцава, магістрант спецыяльнасці "Мастацтвазнаўства" ВДУ імя П.М. Машэрава). Першая вялікая экспазіцыя прадставіла гледачам дыпломныя і творчыя работы студэнтаў акадэміі, што былі выкананы ў апошнія два дзесяцігоддзі. Другая частка праекта пад назвай "Арт-лінія" адкрылася 19 мая ў выставачнай зале мастацка-графічнага факультэта.

Беларуская школа графікі без перабольшвання адна з наймацнейшых у Еўропе. Яе "калыскай", безумоўна, з'яўляецца Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў. Менавіта тут на кафедры графікі сфарміраваліся лепшыя традыцыі нацыянальнай школы, на працягу многіх гадоў удасканальвалася майстэрства прадстаўнікоў гэтага віду мастацтва.

Выстаўка дае магчымасць пазнаёміцца з разнастайнасцю графічных тэхнік праз работы сучасных беларускіх аўтараў розных пакаленняў. Гэтую выставу можна назваць сапраўдным фестывалем тэхнік, тэхналогій, творчых манер і памкненняў.

Праект створаны ў межах плённага супрацоўніцтва кафедры выяўленчага мастацтва з Беларускай дзяржаўнай акадэміяй мастацтваў па падрыхтоўцы спецыялістаў другой ступені адукацыі па накірунках "Мастацтвазнаўства" і "Арт-менеджмент".

« »

18-га мая ў Віцебскім мастацкім музеі гледачам была прадстаўлена выстаўка "З любоўю з Брэста. «Мы – худграф»". У экспазіцыі жывапісныя і графічныя творчыя работы выпускнікоў мастацка-графічнага факультэта розных пакаленняў з сярэдзіны 1960-х гг. да пачатку 2000-х гг., што сёння жывуць на Брэстчыне.

« »

1 чэрвеня, у рамках святкавання Дня абароны дзяцей, у ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна" была адкрыта выстаўка творчых работ Адукацыйнага цэнтра "Арт-квадрат" пры мастацка-графічным факультэце ВДУ імя П.М. Машэрава. Выстаўка прадстаўляе магчымасць пазнаёміцца з творчасцю юных мастакоў цэнтра, убачыць вялікую колькасць цікавых работ, якія выкананы ў розных тэхніках і ўвасабляюць творчую фантазію, дзіцячую непасрэднасць і лёгкасць у рабоце з вобразамі.

« »

У рабоце журы міжнароднага пленэру-конкурсу юных мастакоў "Палітра Прыдзвіння", прысвечанага І.Ф. Хруцкаму, прымалі ўдзел дацэнты кафедры выяўленчага мастацтва С. Сотнікаў і М. Цыбульскі. У выставачнай зале дзяржаўнай установы адукацыі "Дзіцячая мастацкая школа імя І.Ф. Хруцкага г. Наваполацка" 8 чэрвеня адбылося падвядзенне вынікаў і адкрыццё заключнай выставы пленэра-конкурсу юных мастакоў.